Завецца ж спадчына мая ўсяго старонкай роднаю
Янка Купала

Маладзечанская газета

...ета ўзнагароджана:
...аровай граматай Вярхоўнага Савета БССР,
...аровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Грамадска-палітычнае выданне.
Заснавана ў верасні 1939 года
СУБОТА
20
лютага
2016 года
№14 (12257)
mgazeta.by
Кошт у розніцу:
серада – 1100 рублёў,
субота – 4100 рублёў.

МГ

# Моладзь за ўстойлівае развіццё

ІНІЦЫЯТЫВЫ

**Наша школа стала партнёрам маладзечанскай гімназіі-каледжа мастацтваў па ажыццяўленні ініцыятывы «Стварэнне ўмоў для праяўлення і рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў па ўстойлівым развіцці Маладзечанскага раёна», якая была прызнана лепшай на конкурсе ЕС/ПРААН і ўдастоена гранта арганізацыі.**

**Устойлівае развіццё – гэта працэс эканамічных і сацыяльных змен, калі эксплуатацыя прыродных рэсурсаў, накіроўванне інвестыцый, арыентацыя навукова-тэхнічнага развіцця, развіццё асобы і інстытуцыянальныя змены дапасаваныя і ўмацоўваюць цяперашні і будучы патэнцыял для задавальнення чалавечых патрэб і памкненняў. У многім гэта тычыцца забеспячэння якасці жыцця людзей.**

Нядаўна мы сустрэліся з навучэнцамі гімназіі-каледжа, якія расказалі пра мерапрыемствы па прапагандзе мэт устойлівага развіцця, што праводзяцца ў іх навучальнай установе і ў горадзе. Так, васьмікласнікі займаюцца харэаграфіяй з выхаванцамі сацыяльна-педагагічнага цэнтра, разам з настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Валянцінай Конан вывучылі рэцэпты страў беларускай кухні і навучыліся гатаваць іх, праводзяць акцыі «Жыццё са смакам беларускай кухні». Дзевяцікласнікі Мікіта Андрыевіч і Вікторыя Мілер паведамілі, як у час інтэрактыву «Пагавары са мной», што праводзіцца сумесна з адзінаццацікласнікамі, гімназісты вырашаюць праблемы стасункаў паміж бацькамі і дзецьмі. Навучэнцы 9 класа стварылі агітгрупу, якая тлумачыць праблемы інтэрнэт-залежнасці. Члены Савета гімназістаў пазнаёмілі з сацыяльным праектам «Маршруты памяці», расказалі аб рабоце па навядзенні парадку на Сакалінай гары ля вёскі Ленкаўшчына, аб вывучэнні і аднаўленні гісторыі гэтага памятнага месца.

Хвалююць моладзь і праблемы ачышчэння Ушы, аднаўленне экасістэмы лясного масіву. Так з'явілася сумесная з навучэнцамі сярэдняй школы №9 экакаманда «Рух».

Цікавым для ўсіх быў аповед настаўніка англійскай мовы Максіма Міхайлава аб рабоце інтэрнэт-клуба «Павуціннe.arts» па супрацоўніцтве з iEARN-Belarus, сеткавай супольнасцю педагогаў, школ, арганізацый, студэнтаў, навучэнцаў і іх бацькоў, якія жывуць у розных кутках Беларусі і ўдзельнічаюць у адукацыйных інтэрнэт-праектах.

Госці пастараліся пераканаць вучняў нашай школы ў тым, што рэалізацыя ініцыятыў – гэта ўнікальная магчымасць паказаць сябе, сумесна вырашыць пытанні, што ўзнікаюць, і проста зрабіць жыццё лепшым і больш цікавым. Нездарма кажуць, што «шмат малых людзей у мностве малых гарадоў і вёсак, калі робяць шмат малых спраў, змяняюць свет».

Інфармацыйныя сустрэчы хутка пройдуць у Палачанскай і Хажоўскай сярэдніх школах. А затым адбудуцца кірмаш маладзёжных ідэй, адкрыты раённы фестываль дзіцяча-дарослых ініцыятыў па ўстойлівым развіцці Маладзечанскага раёна, паездка на Браслаўшчыну па абмене вопытам арганізацыі ўзаемадзеяння моладзі і органаў улады. Вынікам работы стане стварэнне малога інкубатара маладзёжных ініцыятыў Маладзечанскага раёна.

**Уладзіслаў КАРЧМІТ,**
**навучэнец 10 класа Красненскай СШ.**